***Слайд 1*** **“Нягаснаю зоркай ты ў небе Радзімы навекі!”**

***Літаратурна-музычная імпрэза***

***да 130-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча.***

*Сцэна прыбрана вышыванымі ручнікамі. Стол засланы даматканым абрусам. На стале партрэт Максіма Багдановіча, побач у збанку букет з жытнёвых каласкоў, свечкі. На экране дэманструюцца слайды.*

***Слайд 2***

**Чытальнік** **Сцюжны час, бязмежна суровы.**
**Спіць народ, нібы зерне ў раллі.**

**Ты прыйшоў**
**І гарачым словам**
**Рунь узняў на роднай зямлі.**
**Ты сказаў нам:**
**«Унукі Скарыны,**
**Дзе ваш гонар, моц і краса?**
**Ёсць і ў вас, як і ў іншых, святыня.**
**Не давайце святыні псам!**
**Не давайце з яе глуміцца,**
**Бо праспіць яна ясну зару,**
**Бо святы ізумруд заімгліцца**
**У пярсцёнку тваім, Беларусь».**
**Ты устаў на лютую сечу,**
**Бітву вечную сонца і хмар,**
**Узваліўшы на юныя плечы**
**Святагораў народны цяжар.**
**І не вынеслі жылы напругі:**
**Знік ты, лебедзь, у хвалях сівых,**
**Сплыў крывёю, загінуў «за другі»,**
**За мяне, за вас і за ўсіх.**
**І застаўся ты ў нашых душах,**
**Хоць навекі знік у палях,**
**Вечна светлы і вечна дужы,**
**Вечна юны, як наша зямля.**
**Мы табой ганарымся - і плачам.**
**Мы нясём цябе ў сэрцы праз дым.**

**Нізка голаў схіляю, юнача,**
**Перад вечным глаголам тваім.**
**Смела крочу цяпер у пяскі я**
**Перад светлай заветнай гарой,**
**Бо як ёсць у народа такія -**
**Не загіне давеку народ.** */У.Караткевіч. Багдановічу/*

**Вяд.1** Максім Багдановіч – сонца беларускай паэзіі, гонар і сумленне нацыі, паэт незвычайнага лёсу і такога ж незвычайнага таленту, чые вершы не толькі ўзор класікі у яе сапраўдным азначэнні, яны - сцвярджэнне гуманізму, грамадзянскасці, патрыятычнага служэння Бацькаўшчыне.

**Вяд.2** Максіма Бадановіча не назавеш абраннікам лёсу. Ён жыў адарвана ад Беларусі, ад запаветнай роднай зямлі, свайго народа і памёр на чужыне, пакутна, адзінока.

Усяго чвэртку веку пражыў паэт. Усяго дзесяць гадоў працягвалася яго творчая дзейнасць.

**Але ўспомніць яшчэ зорку свет,**
**Бо ў сэрцах гарыць яе след.**
**Так свабодна, так ярка пражыць –**
**Лепшай долі няма на зямлі…**

**Вяд.1** Паэтычная зорка Багдановіча зіхаціць над усім светам, і ўсё ў новых і новых сэрцах, сэрцах чуйных да сапраўднай паэзіі, загараецца яе святло. І ў паэтычны вянок прысвечаных яму вершаў уплятаюцца ўсё новыя і новыя радкі.

***Слайд 3***

**Чытальнік**

**Вось валошкі, рамонкі, уюнок.**
**Ціха крочу сцяжынкаю вузкай.**
**Для цябе я збіраю вянок**
**З сціплых кветак зямлі**
**беларускай.**
**Я зрываю і ружы, і мак,**
**І, напэўна, зрываю не першай**
**Для цябе, беларускі юнак,**
**За твае незабыўныя вершы.**
**Мне балюча і горка зусім,**
**Што зрабіць мне, каб кветкі**
**не звялі?**
**Мог бы жыць і тварыць ты**
**і далей.**
**Ды каму гэты кінеш папрок?**
**Не паможаш ні смуткам, ні**
**плачам.**
**Ты прымі гэты сціплы вянок**
**Ад сучасных мадон, ад**
**зямлячак**
**Я не ўсё, што хацела, сказала,**
**У нашых сэрцах жывеш ты, павер.**
**І кахання, што знаў гэтак мала,**
**У цябе вельмі многа цяпер.**
**І твае чарадзейныя словы**
**Даказалі даўно ўсяму свету,**
**Як пяшчотна гучыць наша мова**
**У сапраўдных вялікіх паэтаў.**
**Беларусы табой ганарацца,**
**Тут імя тваё дорага ўсім,**
**І так хораша нам называцца**
**Землякамі тваімі, Максім.** */ Т. Дарошка. Максіму Багдановічу/*

**Вяд. 2** Ва ўспамінах пра Максіма, напісаных яго бацькам, ёсць такое сведчанне: ”… па складзе свайго характару, мяккага, жаноцкага, па весялосці свайго нораву, жвавасці, спагадлівасці і ўражлівасці, па паўнаце і мяккасці назіранняў, па сіле ўяўленняў, пластычнасці і разам з тым маляўнічасці вынікаў яго творчасці ён (Максім) больш за ўсіх нагадваў сваю маці, асабліва ў дзяцінстве”.

Хто ж была тая жанчына, якая дала Беларусі аднаго з найвыдатнейшых песняроў?

***Слайд 4***

**Вяд.1** Маці Максіма – Марыя Апанасаўна Мякота – была дачкой наглядчыка павятовай бальніцы ў г. Ігумене. А калі бацька памёр і сям’я засталася без сродкаў для існавання – маці аддала траіх дзяцей, у тым ліку і Марыю, у Мінск у дзіцячы прытулак.

На прыгожую, жвавую, багата адораную здольнасцямі дзяўчынку звярнула ўвагу апякунка прытулку губернатарша Пятрова. Яна ўзяла Машу да сябе ў дом, клапацілася пра развіццё яе здольнасцей. Дзяўчынка шмат чытала, любіла слухаць музыку, навучылася добра іграць на фартэпіяна. Пасля скончыла ў Мінску жаночае Аляксандраўскае вучылішча і паступіла ў земскую настаўніцкую школу ў Пецярбургу.

30 кастрычніка 1888 года Марыя стала жонкай Адама Багдановіча. Мужа свайго яна вельмі любіла, бачыла ў ім ажыццяўленне сваіх мар і спадзяванняў.

**Вяд. 2** Бацька Максіма - Адам Ягоравіч - паходзіў з сям’і прыгонных сялян. Але з дзяцінства выявіў выдатныя здольнасці да навукі і паспяхова скончыў пачатковую школу. Пасля заканчэння Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі ён спачатку настаўнічаў, затым працаваў загадчыкам гарадскога пачатковага вучылішча ў Мінску.

*Слайд 5*

**Вяд. 1** Напачатку маладая сям'я жыла ў Мінску, дзе 9 снежня 1891г. і нарадзіўся Максім. Праз шэсць месяцаў Багдановічы пераехалі ў Гродна.

Пазбаўленая сама многіх радасцей у дзяцінстве, Марыя Апанасаўна аддавала усю сваю цеплыню і пяшчоту дзецям. Яны сталі сэнсам яе жыцця, яе гонарам і надзеяй. Педагог па адукацыі, яна імкнулася ў выхаванні дзяцей абапірацца на найноўшыя дасягненні педагагічнай навукі. Прыдумваліся адпаведныя гульні, набываліся ці рабіліся ўсялякія "разумныя" цацкі, якія павінны былі развіваць інтэлект, памяць, абуджаць фантазію.

Пастаянным спадарожнікам сям'і была музыка. Марыя Апанасаўна добра іграла на фартэпіяна, няблага спявала, акрамя таго валодала літаратурнымі здольнасцямі, пісала апавяданні.

Але Марыі Апанасаўне было адпушчана вельмі мала жыцця. На дваццаць восьмым годзе жыцця яна назаўсёды пакінула зямны свет. Максіму было тады ўсяго пяць гадоў.

*Слайд 6*

**Вяд.2** Пасля смерці маці сям'я Багдановічаў пераязджае ў Ніжні Ноўгарад. Гэтае ж расстанне з радзімаю назаўсёды павязалася ў Максіма з адчуваннем сіроцтва.

І, як да маці, праз гады будзе імкнуцца ён на радзіму… Ці не тут тоіцца прычына вострай меланхоліі, што адчуваецца ў шматлікіх творах паэта.

**Вакол мяне кветкі прыгожа красуюць.**
**Маркотна між іх я хаджу адзінок,**
**Аж бачу – мне сіняй галоўкай ківае**
**Наш родны, забыты ў цяні васілёк.**
**"Здароў будзь, зямляча!" Чуць бачны ў даліне,**
**Панура, нявесела шэпча ён мне:**
**"Ўспамянем, мой дружа, ў багатай чужыне**
**Аб беднай, далёкай сваёй старане".**

*Слайд 7*

**Вяд. 1** На шчасце Максіма ў Ніжнім Ноўгарадзе знайшлі прытулак і сем'і бацькавых сясцёр. І Максім любіў прападаць у цёткі Магдалены, дзе шанавалі беларускія звычаі і абрады: спраўляліся дзяды, каляды, гуканне вясны, вялікдзень, сёмуха. Тут чуў ён беларускія песні, казкі, прыказкі і прымаўкі, крылатыя словы. Гэта была першая школа "беларусікі" будучага паэта.

**Вяд.2** Вучыцца Максім пачаў з шасці гадоў, пад наглядам бацькі. Адам Ягоравіч аддаў у распараджэнне дзяцей досыць багатую бібліятэку. У ёй было шмат разнастайных кніг аб Беларусі. Па слоўніку Івана Насовіча Максім самастойна пачаў вывучаць беларускую мову. А ў адзінаццаць паступіў у першы клас Ніжагародскай гімназіі.

**Вяд.1** У Максіма было дзесяць сясцёр і братоў. Яны нараджаліся, паміралі. Дастатку ў доме не было. Сям'я жыла беднавата. Максім ніколі не меў добрай вопраткі і не звяртаў на гэта ўвагі. У Яраслаўскую гімназію прыехаў у форме, пашытай з мультану (гімназісты насілі форму з сукна).

А да ўсяго ўжо з дванаццаці год да Максіма прылепіцца спадчынная хвароба – сухоты.

*Слайд 8*

**Вяд.2** Усе, хто ведаў паэта, не прамінаді кожны раз падкрэсліць, што гэта быў вельмі прыгожы юнак, высокі, з каштанавымі валасамі, што хвалiста пераліваліся, з карымі вачыма, адухоўленым тварам. Хто б, калі і дзе не сустракаў яго, Максім амаль заўсёды хадзіў з кнігай у руках і пад пахай. За гэта бацька і сябры называлі яго Максімам-кніжнікам.

Паэтычны дар у Багдановіча прарэзаўся рана, у 10 – 11 гадоў.

У "Нашай ніве" ужо ў 1907 годзе быў надрукаваны першы твор 16-гадовага Максіма а, пазней ён стаў яе пастаянным аўтарам. Ледзь не ў кожным нумары з'яўляліся яго вершы, затым і артыкулы, літаратурныя агляды, пераклады. І гэта натхняла маладога паэта, давала яму новыя сілы: ён рос на вачах, гэты Богам даны Багдановіч.

*Слайд 9*

**Вяд.1** Яго моцна цягнула на радзіму, так хацелася пабачыць сваіх землякоў, пачуць з іх вуснаў жывую беларускую мову, якая была ў яго ў крыві, у свядомасці і падсвядомасці адначасова, пра якую ён сніў начамі, якая гучала непаўторнаю мелодыяй, анёльскай музыкай і ў вушах, і ў сэрцы.

І, нарэшце, у чэрвені 1911г. Максіму выдаліся два шчаслівыя летнія месяцы, якія ён пасля заканчэння гімназіі правёў у Беларусі, пераважна ў Ракуцёўшчыне. Гэта быў вельмі плённы і радасны час, калі добра думалася і яшчэ лепш пісалася.

*Слайд 10*

**Вяд. 2** Вялікаю падзеяй стала паездка ў Вільню па запрашэнні “Нашай нівы”.

Падняўшыся ўверх па Вастрабрамскай вуліцы, Багдановіч спыніў свой позірк на старажытнай сімволіцы, што засталася на старых мурах. Пазней паэт створыць верш “Пагоня” - выразны водгалас падарожжа менавіта таго лета, і ў аўтографе напіша: “У старой Вільні на муру Гострай Брамы высечаны герб мястовы – ваякі на імкнушчых конях. Герб гэты Вільня атрымала яшчэ за часы Вялікага княства Літоўскага, і завецца ён Літоўскай пагоняй”.

**Чытальнік**

**Толькі ў сэрцы трывожным пачую**
**За краіну радзімую жах, -**
**Успомню Вострую Браму святую**
**І ваякаў на грозных канях.**

**Ў белай пене праносяцца коні, -**
**Рвуцца, мкнуцца і цяжка хрыпяць …**
**Старадаўняй Літоўскай Пагоні**
**Не разбіць, не спыніць, не стрымаць.**

**У бязмерную даль вы ляціце,**
**А за вамі, прад вамі – гады.**
**Вы за кім у пагоню спяшыце?**
**Дзе шляхі вашы йдуць і куды?**

*Слайд 11*

**Вяд.1** У віленскай калекцыі збіральніка нацыянальных каштоўнасцей Максім Багдановіч упершыню ўбачыў не толькі рэдкія манускрыпты далёкіх часоў, але і залатыя слуцкія паясы. Тут паэт пачуў і захапляючую гісторыю іх ткацтва. Свае ўражанні і неадольнае зачараванне мастацкай вартасцю адмысловых паясоў слуцкіх ткачых паэт спрасаваў ва ўпругія радкі верша пад назвай “Слуцкія ткачыхі”.

*/Гучыць песня “Слуцкія паясы”, муз. У.Мулявіна/*

*Слайд 12*

**Вяд.2** Кніга лірыкі “Вянок” - гэта гарманічны, цэласны свет чалавека і прыроды, чалавека і красы, адухоўленасці, чалавека і Сусвету. Адзіны прыжыццёвы зборнік Максіма Багдановіча. І сталася гэта на дваццаць першым годзе жыцця маладога паэта.

**Сонца ціха скацілася з горкі;**
**Месяц белы заплаканы свеціць,**
**Аглядае бахматыя зоркі,**
**Цягне з возера срэбныя сеці.**

**У іх русалкі заблуталі косы, -**
**Рвуць і блутаюць срэбныя ніці;**
**Ноч плыве над зямлёй, сее росы,**
**Ноч шапоча русалкам: “Засніце”.**

**Вяд.1** Для беларусаў яго радкі неадрыўна павязаліся з нашай прыродаю, зрабіліся як бы яе часткай. Імі і сёння мы чуем, бачым, успрымаем яе красу.

**Здароў, марозны, звонкі вечар!**
**Здароў, скрыпучы, мяккі снег!**
**Мяцель не вее, сціхнуў вецер,**
**І волен лёгкіх санак бег.**

**Як мары, белыя бярозы**
**Пад сінявой начной стаяць,**
**У небе зоркі ад марозу**
**Пахаладзеўшыя дрыжаць.**

**Вільготны месяц стуль на поле**
**Празрысты, светлы стоўп спусціў**
**І рызай срэбнаю раздолле**
**Снягоў сінеючых пакрыў.**

**Ўзрывайце ж іх санямі, коні!**
**Звіні, вясёлых бомаў медзь!**

**Вакол лятуць бары і гоні,**
**Ў грудзях пачала кроў кіпець.**

А вось вясна ў шлюбным цвеце з каляровым полымейкам матыля:

*Слайд 13* */Гучыць песня“Па-над белым пухам вішань” муз. У.Мулявіна/*

*Слайд 14 - 15*

**Вяд.1** Лірыка Максіма Багдановіча ў значнай меры біяграфічная. Ганна Какуева – сястра таварыша Максіма, гімназістка, удзельніца вясёлых студэнцкіх вечарынак, на ўсё жыццё паланіла сэрца паэта. Гэта была вельмі прыгожая дзяўчына. Высокая стройная паненка з тонкімі рысамі твару, цёмна-карымі вачыма і доўгімі цёмнымі валасамі. Добра ведала некалькі замежных моў, цудоўна іграла на піяніна. Гэтая мілая, вясёлая дзяўчына прыцягнула ўвагу васемнаццацігадовага Багдановіча, які марыў пра чыстыя і светлыя пачуцці.

**Вяд.2** Але ўсё для Максіма складвалася драматычна, нават трагічна. Галоўная прычына – яго хвароба. Цётка, якая апекавала дзяўчынку, зведаўшы пра хваробу Максіма на сухоты, робіць усё, каб перашкодзіць каханню і амаль сілаю выдае яе замуж за другога. Розумам паэт адчуваў заканамернасць такога зыходу. Розумам, але не душой.

**Мне доўгае расстанне з Вамі**
**Чарней ад Вашых чорных кос.**
**Чаму ж нядобры час прынёс**
**Мне доўгае расстанне з Вамі?**
**Я пабляднеў ад горкіх слёз**
**І трыялет пачаў славамі:**
**Мне доўгае расстанне з Вамі**
**Чарней ад Вашых чорных кос.**

**Вяд.1** Знаёмства з Какуевымі, сустрэчы, размовы з Аняй, магчыма, былі лепшым часам у юнацтве Максіма, не вельмі радасным, азмрочаным хваробай. Бо ў доме Какуевых Максім знайшоў тое, чаго яму так не хапала ў сваёй сям’і. Тут панавала атмасфера нязмушанасці, вяселля і радасці. І далікатны юнак з тонкай, чуллівай душою мог адчуваць сябе свабодна, утульна і лёгка сярод сяброўскай кампаніі аднагодкаў. Гэтая цудоўная атмасфера і вялікае і чыстае пачуццё падаравалі беларускай літаратуры паэтычныя шэдэўры.

**Учора шчасце толькі глянула нясмела, -**
**І развеяліся хмары змрочных дум.**
**Сэрца чулае і млела, і балела,**
**Радасць душу мне шчаміла, быццам сум.**
**Усё жыццё цяпер, як лёгкая завея,**
**Кнігу разгарнуў – а не магу чытаць.**
**Як зрабілася, што пакахаў цябе я, -**
**Хіба знаю я? Ды і нашто мне знаць?**

*Слайд 16* */Гучыць песня “Вераніка”, муз. І. Лучанка/*

*Слайд 17*

**Вяд.2** Само сабой адпала пытанне пра паступленне ў Пецярбургскі ўніверсітэт, таму што горад з неспрыяльным, сырым кліматам не падыходзіў паэту з хворымі лёгкімі. Важкай прычынай была таксама матэрыяльная нястача ў сям’і. Пад націскам бацькі Максім паступіў у Дзямідаўскі юрыдычны ліцэй у Яраслаўлі, хаця сам не хацеў быць ні суддзёй, ні адвакатам, ні пракурорам.

Гэты перыяд азмрочаны пагаршэннем здароўя.

**Вяд.1** Але пагроза ранняга адыходу з жыцця не змусіла Максіма скарыцца абставінам, апусціць рукі і зняверыцца. Наадварот, ён прадэманстраваў незвычайную сілу волі, настойлівасць і стаў адным з самых жыццялюбных беларускіх паэтаў, працаваў апантана і плённа, працягваў жыць беларускімі справамі, спадзяваўся на абуджэнне нацыянальнай годнасці.

*Слайд 18*

**Чытальнік**

**Народ, Беларускі Народ!**
**Ты - цёмны, сляпы, быццам крот.**
**Табою ўсягды пагарджалі,**
**Цябе не пушчалі з ярма**
**І душу тваю абакралі, -**
**У ёй нават мовы няма.**

**Збудзіўшысь ад грознай бяды,**
**Увесь поўны смяротнай жуды,**
**Ты крыкнуць не вольны “Ратуйце!”**
**І мусіш ты “Дзякуй” крычаць.**
**Пачуйце жа гэта, пачуйце,**
**Хто ўмее з вас сэрцам чуваць!**
**Не згасла сонца! Сонца гляне,**
**Усіх падыме ада сна**
**Ён, гэты дзень, яшчэ настане**
**І ачуняе старана.**

**Вяд.2** Страшэнны збег акалічнасцей даймаў Максіма з маленства: сіроцтва, цяжкая хвароба, хатняя неўладкаванасць і вечны боль па Беларусі.

*Слайд 19*

**Даўно ўжо целам я хварэю,**
**І хвор душой, -**
**І толькі на цябе надзея**
**Край родны мой!**
**У родным краю ёсць крыніца**
**Жывой вады.**
**Там толькі я змагу пазбыцца**
**Свае нуды.**

*Слайд 20*

У самым канцы верасня 1916 года, скончыўшы юрыдычны ліцэй, Максім едзе ў Беларусь. У Мінску ён стаў актыўным сябрам “Беларускае хаткі”, якая з’яўлялася народным клубам, цэнтрам дзейнасці беларускай думкі. Ён ужо вядомы паэт, аўтар зборніка “Вянок”, адчуваў сябе сваім сярод сваіх, бо рабіў тое, да чаго ляжала душа.

**Вяд.1** У канцы зімы 1917 года сябрам удалося сабраць грошы каб адправіць Максіма ў Крым на лячэнне. Не дачакаўшыся на радзіме ні гракоў, ні пралесак, ён, ужо ў трэці раз, ехаў у Крым.

Але за Гомелем з-за моцных снежных завей цягнік спыніўся на маленькай бязлюднай станцыі. Тры дні холаду і голаду. Пасля таксама нялёгкая дарога. У краіне ўзвірылася рэвалюцыя. Тлум на станцыях. Чатыры перасадкі моцна даліся ў знакі.

*Слайд 21*

Знясілены дарогаю, ён чатыры дні бясплённа будзе шукаць у Ялце кватэру і зняможаны пошукамі натрапіць на пакой, які здавалі на другім паверсе, ззаду дома, дзе ніколі не было сонца. Харчаваўся ў сталоўцы, а то купляў прадукты і еў сухама.

**Вяд.2** У красавіку Максіму стала зусім дрэнна, блізілася трагічная развязка. Паэт пра гэта ведаў і яшчэ больш настойліва працаваў: думкі і пачуцці, якімі ён жыў, так і прасіліся на паперу.

**Ужо пара дадому збірацца, -**
**Вечар позны, а час не стаіць.**
**Ах, калі б ты магла здагадацца,**
**Як не хочацца мне ўхадзіць.**
**Там, на вуліцы, ні сівер, ні бура,**
**Там адно толькі – мрок, самата.**
**Але як я маркотна, панура**
**Да свайго пацягнуся кута.**
**Думкі нудныя зноў закружацца.**
**Сэрца чулае зноў забаліць…**
**Ах, калі б ты магла здагадацца,**
**Як не хочацца мне ўхадзіць.**

*Слайд 22*

**Вяд.1** У маі, калі на кожным скрыжаванні прадаўшчыцы кветак рады былі за пяць капеек падаць букецік пахкіх ружаў, паэт зусім абнямог. І у сваім лісце раптам мужна рашыўся адкрыцца бацьку: “Добрыдзень, стары верабей. Маладому вераб’ю блага… з ложка ўжо не ўстаю – аслаб канчаткова. Хутка пачнуцца спёкі, трэба будзе ад’язджаць з Ялты, а як у такім стане паедзеш? …” Ліст адняў столькі сілаў, што Максім так і не дапісаў яго. Бяссільна

апусціўся на абрыдлы ложак. Адзінае, што ён змог, - пацягнуцца рукой да кніжкі…Ліст так і астанецца неадасланым. Бацька прачытае яго, калі ўжо ў Ялце сына пахаваюць”.

**Ты быў, як месяц, адзінокі:**
**Самотна жыў, самотна ўмёр.**
**Хоць свет і людны, і шырокі,-**
**Ты быў, як месяц, адзінокі.**
**Красу, і светласць, і прастор**
**Шукаў – і, ад усіх далёкі,**
**Ты быў, як месяц адзінокі:**
**Самотна жыў, самотна ўмёр.**

25 мая 1917 года ўночы “у краіне светлай… у белым доме ля сіняй бухты” ён назаўсёды развітаецца з жыццём, пражыўшы няпоўныя дваццаць шэсць гадоў.

**Чытальнік**

**Далёка ад роднага краю,**
**Чый вобраз па кроплі збіраў,**
**У трызненні белага маю**
**Самотны паэт паміраў.**
**Ён ведаў, што болей не ўстане,**
**Апошнія злічаны дні.**
**Чаму ж аніхто не загляне**
**З вялікай і мілай радні?**
**Нячасная доля – памерці**
**У смутку-тузе аднаму.**
**Дзвярыма на першым паверсе**
**Хтось грукнуў, здалося яму.**
**Во – крочыць па ўсходках рыпучых,**
**Во – клямкаю бразгае ўжо.**
**І стала ад шчасця балюча:**
**Няўжо гэта праўда? Няўжо?**
**О божа! Сама Вераніка!**
**Яго Вераніка стаіць!**
**Галоўкаю русай панікла,**
**Журботна, тужліва глядзіць.**
**Букет васількоў і рамонкаў**
**Сціскае ля сэрца рукой...**
**Праклятая богам старонка**
**Зайшла да паэта ў пакой!**
**- Ну што ж ты стаіш, Вераніка?**
**Не бойся! Бліжэй падыдзі!**
**Я столькі гадоў цябе клікаў-**
**І ўсё заставаўся адзін.**
**Я зведаў хвіліну адчаю**
**У гэтай чужой старане.**
**Цяпер адзінота, я знаю,**
**Навечна пакіне мяне...**
**За вокнамі пеніўся буйна**
**Захмелены ялцінскі май.**
**За вокнамі ўсплёснула бухта:**
**- Не плач; Вераніка! Бывай!**
**Яшчэ ты паспееш самотна**
**Наплакацца ў горкай журбе,**
**Яшчэ ты адчуеш, як моцна**
**Яго не хапае табе.** */Н.Гілевіч. Апошняе спатканне з Веранікай/*

**Вяд.2** “Раніцай мора нарэшце супакоілася. Гаспадыня, падняўшыся на другі паверх, глянула на кватаранта і адразу зразумела: усё... Ён ляжаў такі заспакоены, без слядоў пакуты на твары. Крыху нават усмешлівы. А рука прыціскала да грудзей кніжку з кароткай назваю – “Вянок”.

Ці на пахаванне вянок? Ці на славу? Мы ўжо ведаем на славу. На славу сабе. На славу свайму народу.”

***Слайд 23***

**Чытальнік**

**Здавён ужо быў адзінокі ён.**
**Сам па сабе, сам па сабе ён быў:**
**Ад бацькоўскага краю далёка,**
**Адзінокі яго любіў.**
**Незайздроснасць песнярскага лёсу:**
**Быў адзін, а любіў усіх:**
**Пагарджаных, пакрыўджаных,**
**босых,**
**Згаладнелых, сляпых, глухіх.**
**Так пражыў на зямлі, як бязродна,**
**Сам не засцячы людзям нідзе:**
**Жыў самотны, памёр самотны,**
**І хавалі амаль без людзей.**
**Нехта бег напрасткі да порта,**
**Нехта ставіў радні манумент...**
**Хто такі малады памёр там?..**
**Так... Якісьці прыезджы студэнт...**

***Слайд 24***

**Вяд. 1** Суцешым сябе, як звычайна суцяшаюць у такіх выпадках у народзе. Як ва ўсіх праведнікаў, можа, быў і ў Максіма лёгкі канец. Ціха ахінула сваёю наміткаю непрытомнасць. І прыйшла маці, такая як у маленстве, і паклікала. Ён хацеў спачатку ад яе адхінуцца рукой: памяць яшчэ як бы ў астатні раз падказала – нядобра, калі да сябе кліча нябожчык... Але маці паклікала зноў. Голас ласкавы, пяшчотны, якога ён не чуў, але на які ўсё як бы спадзяваўся праз усе астатнія гэтыя дваццаць гадоў без яе. І ён, шчаслівы ўжо ўпершыню бесклапотны, падаўся насустрач её...

**Чытальнік**

**Маладыя гады,**
**Маладыя жадання!**
**Ні жуды, ні нуды,**
**Толькі шчасце кахання.**
**Помніш толькі красу,**
**Мілы тварык дзявочы,**
**Залатую касу,**
**Сіняватыя вочы.**
**Цёмны сад - вінаград,**
**Цвет бяленькі вішнёвы, -**
**І агністы пагляд,**
**І гарачыя словы.**
**Будзь жа век малады,**
**Поўны светлымі днямі!**
**Пралятайце, гады,**
**Залатымі агнямі!**

**Вяд. 2** Сёння мы яшчэ раз прайшліся па незабыўных сцежках паэта, паслухалі чароўныя радкі яго бессмяротнай паэзіі. І хоць няўмольны час нясе новыя рытмы, новыя мелодыі і песні, але песні Максіма Багдановіча не згубіліся, не растварыліся ў імклівым бегу часу. Яны і сёння неабходны нашым сэрцам, яны неабходны сучаснасці і будучыні.

*/Гучыць раманс “Зорка Венера” муз. С. Рака-Міхайлоўскага, У.Мулявіна /*

Бібліятэкар СШ№11 г.Ліды Т.Зенюкевіч